

**Смяховіч, М.У. Сельская гаспадарка Беларусі ў 1943–1991 гадах: этапы развіцця, дасягненні, вопыт** / М.У. Смяховіч; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларуская навука, 2017. – 439, [1] с. – ISBN 978-985-08-2120-1.

Дабрабыт народа і харчовая бяспека самым непасрэдным чынам залежаць ад развіцця сельскай гаспадаркі. Аграрнае пытанне аказвае моцны ўплыў на сацыяльнае становішча любой дзяржавы, і Беларусь тут не выключэнне. У гэтым кантэксце бачыцца актуальным прадмет даследавання, яго сацыяльная і навуковая запатрабаванасць.

Упершыню ў беларускай гістарыяграфіі ў манаграфіі ўсебакова даследавана дзейнасць партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва СССР і БССР па рэалізацыі асноўных мэт аграрнай палітыкі савецкай дзяржавы з восені 1943 года па 1991 год. Вывучэнне аб'ектыўных вынікаў гістарычнай дзейнасці беларускага народа па вырашэнні аграрнага пытання грунтавалася на базе аналізу шырокага кола апублікаванай літаратуры, вывучэння вялікага пласта невядомых раней архіўных крыніц. Гэта дазволіла падтрымаць аўтарскую канцэпцыю працэсу развіцця сельскай гаспадаркі Беларусі з вызначэннем і характарыстыкай яе этапаў, асаблівасцей і заканамернасцей.

У манаграфіі разгледжаны ўласцівасці развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы сельскай гаспадаркі ў розныя перыяды; высветлена эфектыўнасць выкарыстання вытворчых фондаў і машынна-трактарнай тэхнікі. Адначасова даследчыкам вызначаны роля і месца адміністрацыйна-ўпраўленчага персаналу кіруючых структур у арганізацыі аграрнай вытворчасці, ахарактарызавана становішча ў галіне арганізацыі і аплаты працы калгаснага сялянства, а таксама адлюстраваны спецыфіка, асаблівасці і вынікі рэфармавання аграрнай вытворчасці ў 1986–1991 гадах.

Кніга разлічана на шырокае кола чытачоў, але будзе асабліва карыснай у навукова-даследчай працы і вучэбным працэсе.



**Лобач, У.А. Святыя крыніцы Беларусі** / Уладзімір Лобач, Таццяна Валодзіна. – Мінск: Беларуская навука, 2016. – 188 с. : іл. – (Традыцыйны лад жыцця). – ISBN 978-985-08-2072-3.

Вялізная колькасць разнастайных водных аб'ектаў, характэрных для этнічнай прасторы беларусаў, звычайна выступае як своеасаблівая візітная картка нашай краіны. Буйныя рэкі і азёры, такія як Дзвіна, Дняпро, Нёман, Прыпяць, Нарач, Свіцязь, даўно сталі сімваламі Беларусі. Але менавіта крыніцы, гэты непаўторны цуд жывой вады, якая прабіваецца з-пад зямлі, займаюць у жыцці беларусаў вельмі адметнае і асаблівае месца.

Кніга прысвечана дзівоснаму феномену беларускай этнакультурнай традыцыі – ушанаванню святых крыніц. Гэта ўнікальная з'ява мае тысячагадовую гісторыю: пакланенне культавым крыніцам, якія ў народзе здаўна і дагэтуль лічацца святымі, мела шырокае распаўсюджанне і неверагодную ўстойлівасць на землях Беларусі.

Легенды, паданні, цуды ацалення, абрады і каляндарныя святы, звязаныя з ушанаваннем крыніц беларусамі, – пра ўсё гэта даведаецца чытач у выданні. Аўтары спрабуюць адказаць на пытанне, чаму менавіта крыніцы сталі самымі шанаванымі прыроднымі аб'ектамі ў беларускай традыцыі? Навошта крыніцам прыносяць дары і чаму кожная з іх мае сваё каляндарнае свята? Як правільна ўпарадкаваць культавую крыніцу?

Аўтары імкнуцца давесці да шырокага кола суграмадзян важную думку, што ўсе святыя крыніцы Беларусі – гэта ўнікальныя помнікі прыроды, гісторыі і культуры, якія ствараюць непаўторнае аблічча нашай краіны.

У кнізе змешчана вялікая колькасць экспедыцыйных фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў, а таксама фотаздымкаў з усіх рэгіёнаў Беларусі.

*Кнігі для агляду прадастаўлены Прэзідэнцкай бібліятэкай Рэспублікі Беларусь.*

# Беларуская Думка

№ 8 2017
ЖНІВЕНЬ




УБОРАЧНАЯ КАМПАНІЯ

**ПРАЦОЎНЫЯ БУДНІ ХЛЕБАРОБАЎ У ФОТАЗДЫМКАХ БЕЛТА**

**СЕМЕЙНЫЕ ПОРТРЕТЫ В ИНТЕРЬЕРЕ ЖАТВЫ**



ТЭМА НУМАРА
**500 ГАДОЎ БЕЛАРУСКАМУ КНІГАДРУКАВАННЮ**

Лілія АНАНІЧ
**НАДРУКАВАНАЕ ЗАСТАНЕЦЦА...**

Владимир КАЛМЫКОВ
**ФРАНЦИСК СКОРИНА: МЕЖДУ ПРОШЛЫМ И БУДУЩИМ**



Александр ГУРА
**ОСНОВЫ КОНСОЛИДАЦИИ ОБЩЕСТВА**



ISSN 0023-3102